# Дзе жывуць успаміны

## *Шчыры погляд на беларускую вёску*

**«Цеплыня, мір, любоў» – такія асацыяцыі выклікаюць творы Антаніны Маісеевай, чыя персанальная выстаўка «Мой свет» працуе ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Праект запрашае наведвальнікаў абстрагавацца ад звыклага гарадскога пейзажу і натхніцца вобразамі сапраўднай беларускай вёскі, якія сёння, на жаль, сустракаюцца ўсё радзей.**

Шэраг палотнаў мастачкі прысвечаны гарадскому пасёлку Астроўна, у якім яна расла, вучылася, пазнавала свет. Антаніна Маісеева не мае прафесійнай мастацкай адукацыі. Скончыла бібліятэчны факультэт Ленінградскага інстытута культуры і ўсё жыццё працавала ў бібліятэцы. Жывапісам Антаніна Максімаўна займаецца з 2001 года, працуе пераважна з алеем. З 2003-га з'яўляецца членам клуба мастакоў-аматараў «Контур», рэгулярна ўдзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках.



*«Гулянне на Івана Купалу», 2017 г.*

Творчасць Антаніны Маісеевай прыцягвае ўвагу шчырасцю і цеплынёй. Тут няма філасофскай глыбіні, складанай канцэпцыі, наватарскага падыходу, аднак простыя сюжэты кранаюць нябачныя струны душы, пераносяць гледача ў мінулае, дзе «сялянскі свет» быў часткай вялікай самабытнай культуры. Увогуле тэма сялянства, вёскі займае значнае месца ў творчасці мастачкі. У аснове большасці палотнаў – успаміны з уласнага жыцця і непасрэдны візуальны вопыт. Асаблівая ўвага да індывідуалізацыі вобразаў не перашкаджае іх тыпізацыі, звароту да метафар і гратэску. Але ва ўсім дамінуе эмацыянальнасць, свабода вобразнай інтэрпрэтацыі.

У экспазіцыі дэманструецца шмат твораў з выявамі жывёл (пераважна хатніх). Нярэдка гэта сапраўдныя партрэты, у якіх знаходзяць адлюстраванне рысы, уласцівыя чалавеку, – розум, адданасць, даверлівасць. Значнае месца займаюць і шматфігурныя кампазіцыі з беларускімі сюжэтамі. Нягледзячы на наіўны стыль, які многім здаецца занадта простым, карціны, насычаныя дэталямі, прыцягваюць увагу нават самых скептычна настроеных гледачоў. У партрэтных вобразах і сюжэтных творах адчуваецца шагалаўская тэма. Пры напісанні кожнай работы мастачка дасканала распрацоўвае драматургію дзеяння. Здаецца, перад намі сапраўдная сцэна са спектакля, дзе кожны герой мае сваю ролю, без якой дзеянне будзе няпоўным.

Творца выкарыстоўвае яркія, насычаныя колеры, робіць акцэнт на дынаміцы карціны. На выстаўцы «Мой свет» можна ўбачыць сцэны з вясковай паўсядзённасці – народныя гулянні, збор ураджаю і іншыя. Дзякуючы яркай палітры творы набываюць асаблівую атмасферу жыццярадаснасці, нават калі адлюстроўваюць звычайныя працоўныя дні. Кожны вобраз – ад сялянскай страхі да бульбянога поля – прапісаны з любоўю



*«Свінчына шчасце», 2012 г.*



*«Раніцай на пашы», 2014 г.*

і павагай, што робіць жывапіс блізкім і зразумелым без дадатковых тлумачэнняў. Выстаўка прапануе вярнуцца ў мінулае, дзе вёска жыве і квітнее, дзе няма гарадскога пылу і адзіноты – толькі спакой, пачуццё адзінства і ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

Жывапіс Антаніны Маісеевай нагадвае пра каштоўнасць каранёў, пра важнасць памяці, пра людзей і месцы, якія фарміруюць асобу. І хаця тэхніка аўтара можа здацца некаму недастаткова «акадэмічнай», менавіта ў гэтым і ёсць яе асаблівая прыцягальнасць.

Наведвальнікаў галерэі «Універсітэт культуры» чакае сустрэча з сапраўдным беларускім характарам – адкрытым, цёплым, крыху іранічным і вельмі жыццялюбным. Выстаўка працуе да 23 мая.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**

## Прыгожае пісьменства ў эфіры

Канал Культура Беларускае радыё

У аўтарскай праграме Навума Гальпяровіча «Нам засталася спадчына» ў чацвер пойдзе гаворка пра жыццё і творчасць Сяргея Дзяргая.

Вершы Аляксандра Быкава можна пачуць у праекце «Прачулым радком» у суботу і нядзелю.

Новы праект канала «Культура» і часопіса «Маладосць» «Маладыя галасы беларускай літаратуры», які выходзіць у нядзелю, прадстаўляе Паліну Дваранскую.

«Радыёсерыял» пазнаёміць са старонкамі рамана «Доўгае лета» Нікалае Штэфанеску. У «Радыёбібліятэцы» – «Марцін Ідэн» Джэка Лондана, выканаўца – артыст Алег Сідорчык.